**Пасадка новых дрэў праз Інтэрнэт**

Напярэдадні Сусветнага дня навакольнага асяроддзя, які адзначаецца ва ўсім свеце 5 чэрвеня, ААН выступіла з новай глабальнай ініцыятывай: пасадзіць сем мільярдаў новых дрэў да канца гэтага года. Для рэалізацыі гэтай мэты прапаноўваецца актыўна выкарыстаць магчымасці сеткі інтэрнэт.

Па звестках Праграмы ААН па навакольным асяроддзі (ЮНЕП), ужо ў 166 краінах пасаджана каля 3,1 мільярда новых дрэў. "Мы хочам пасадзіць сем мільярдаў дрэў да пачатку правядзення вырашальнай сустрэчы па Канвенцыі ААН аб кліматычных зменах у снежні цяперашняга года, а без падтрымкі школ і асацыяцый, урадаў, дзелавых колаў і асобных грамадзян з задачай не справіцца", — заявіў дырэктар ЮНЕП Ахім Штэйнэр. У ААН лічаць, што калі нават палова жыхароў планеты пасадзяць усяго па адным дрэве, то гэта стане "гучным напамінкам сусветным лідарам аб неабходнасці заключэння пагаднення па праблеме змены клімату".

***Леанід Тугарын.***

**Источник:** Звязда.-2009.-26 мая.-С.5.